# УДАКЛАДНЕНЬНІ

№ 5 «ARCHE» за 2010 год, які меў агульную вобразную назву «Як Гітлер мог перамагчы», быў цалкам прысьвечаны праблематыцы Другой сусьветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. У дадзеным нумары было змешчана шмат разнастайных ілюстрацыяў, пры падрыхтоўцы подпісаў да якіх рэдакцыя па розных прычынах ня здолела пазьбегнуць пэўных памылак і недакладнасьцяў, на якія ў адмысловых электронных лістах зьвярнулі нашу ўвагу пастаянныя чытачы часопіса гісторык Алесь Гелагаеў і архітэктар Ігар Кручонак. Ня лічачы патрэбным уступаць у дадзеным выпадку ў дыскусію, ніжэй мы проста публікуем іхныя заўвагі і ўдакладненьні, прадстаўленыя для больш простага ўспрыманьня ў таблічнай форме. Рэдакцыя шчыра дзякуе сваім чытачам за ўважлівасьць і гатоўнасьць асабіста спрыяць паляпшэньню якасьці нашага выданьня, а таксама прыносіць прабачэньні за ня выпраўленыя пры рэдактуры (натуральна, не наўмысна) дробныя і буйныя хібы.

## Заўвагі і ўдакладненьні Алеся Гелагаева

| № старонкі | Надрукавана | Правільны варыянт |
|---|---|---|
| 37 | Нямецкі танк PzKpfw III*. | Нямецкі танк PzKpfw IV**. |
| 48 | Нямецкі танк PzKpfw IV на полі бою. Канец чэрвеня 1941 г. | Нямецкі танк PzKpfw II на полі бою. Канец чэрвеня 1941 г. |
| 50 | Падбітая немцамі пад Беластокам савецкая бронемашына. Чэрвень 1941 г. | Падбіты немцамі пад Беластокам савецкі танк. Чэрвень 1941 г. |
| 51 | Нямецкі танк PzKpfw II. | Нямецкі танк PzKpfw III. |
| 54 | Нямецкі танк PzKpfw IV на вуліцах Ашмянаў. Ліпень 1941 г. | Нямецкі танк PzKpfw II на вуліцах Ашмянаў. Ліпень 1941 г. |
| 60 | Дарога да Менску. | Падрыхтоўка латыскіх супрацьпаветраных разьлікаў для латыскай дывізіі СС. Латвія альбо палігон у Прусіі. 1943 г. |
| 207 | Разьбіты бронеаўтамабіль і забіты нямецкі салдат пасьля аднаго з баёў. Ліпень 1941 г. | Разьбіты паўгусенічны БТР і забіты нямецкі салдат пасьля аднаго з баёў. Не раней за 1942—1943 гг. |
| 405 | Узнагароджаньне салдатаў вэрмахту. | Узнагароджаньне латыскіх паліцыянтаў і эсэсаўцаў***. |

## Заўвагі і ўдакладненьні Ігара Кручонка

| № старонкі | Надрукавана | Правільны варыянт |
|---|---|---|
| 38 | Нямецкі танк PzKpfw II. | Нямецкі танк PzKpfw IV. |
| 48 | Нямецкая танкавая калёна. | Нямецкая танкавая калёна падчас нямецка-польскай вайны 1939 г. |
| 48 | Нямецкі танк PzKpfw IV на полі бою. Канец чэрвеня 1941 г. | Нямецкі танк PzAusf II на полі бою. Канец чэрвеня 1941 г. |
| 50 | Падбітая немцамі пад Беластокам савецкая бронемашына. Чэрвень 1941 г. | Падбіты немцамі пад Беластокам савецкі танк БТ-7. Чэрвень 1941 г. |
| 54 | Нямецкі танк PzKpfw IV на вуліцах Ашмянаў. Ліпень 1941 г. | Нямецкі танк PzAusf II на вуліцах Ашмянаў. Ліпень 1941 г. |
| 192 | Немцы ў Менску. | Немцы ў Менску. На пярэднім пляне — трафейны савецкі танк Т-34. |
| 193 | Нямецкія войскі ў Менску. На заднім пляне – Дом ураду. Чэрвень 1941 г. | Нямецкія войскі ўваходзяць у Менск з захаду па вуліцы Савецкай (сёньня — пл. Мясьнікова). Наперадзе — Дом ураду. Чэрвень 1941 г. |
| 193 | Нямецкія войскі на вуліцах Менску. 29 чэрвеня 1941 г. | Нямецкія войскі ўваходзяць у Менск з усходу па вуліцы Горкага (сёньня Багдановіча). Наперадзе — рака Сьвіслач і Верхні горад, справа — Траецкае прадмесьце. 29 чэрвеня 1941 г. |
| 210 | Немцы аглядаюць зьбіты савецкі самалёт. | Немцы аглядаюць зьбіты савецкі зьнішчальнік МиГ-3. |
| 210 | Немцы аглядаюць савецкі самалёт. | Немцы аглядаюць савецкі самалёт УТ-1. |
| 211 (верхняя) | Падбітыя савецкія самалёты. | Падбіты савецкі зьнішчальнік МиГ-3. |
| 211 (ніжняя) | Падбітыя савецкія самалёты. | Зьнішчаныя савецкія самалёты. На пярэднім пляне — пашкоджаны зьнішчальнік И-16/УТИ-4. |
| 212 | Байцы Чырвонай Арміі разглядаюць захоплены нямецкі танк. Чэрвень 1941 г. | Байцы Чырвонай Арміі разглядаюць захоплены нямецкі танк PzKpfw 38(t) (трафейны чэскі). Чэрвень 1941 г. |
| 214 | Салдаты выцягваюць каня, што загруз у багне. | Нямецкія салдаты выцягваюць каня, што загруз у багне. |
| 214 | Падбіты танк. | Падбіты савецкі танк Т-26. |
| 215 | Пасьля бою. | Пасьля бою — пакінутыя савецкія кулямёты «Максім». |
| 219 | Здача савецкіх вайскоўцаў у палон. | Савецкі танкіст на танку Т-26 здаецца ў палон. |
| 549 | Чырвонаармейцы ў Менску. Ліпень 1944 г. | Партызаны на адпачынку ў Менску. Ліпень 1944 г. |
| 550 (верхняя) | Чырвонаармейцы ў Менску. Ліпень 1944 г. | Партызаны на адпачынку ў Менску. Ліпень 1944 г. |
| 550 (ніжняя) | Чырвонаармейцы ў Менску. Ліпень 1944 г. | Палонныя немцы ў Менску. Ліпень 1944 г. |

* Усюды ў ілюстрацыях (у адрозненьне ад асноўнага тэксту) праз недагляд рэдактара нумару фігуруе недакладная абрэвіятура танка — PzKpfv (правільна — PzKpfw) (с. 37–39, 48, 54, 207, 213, 618). У табліцах дадзеная абрэвіятура ўсюды прыводзіцца ў правільным варыянце.

** Заўвага датычыць толькі верхняга фотаздымка.

*** Дадзеную заўвагу незалежна ад Алеся Гелагаева зрабіў таксама і Ігар Кручонак.